Падтрымай "Вясну" на PATREON

Віцебскіх актывістаў аштрафавалі за абарону незалежнасці Беларусі

30.01.2020 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў

У Віцебску 30 студзеня прайшлі апошнія суды над удзельнікамі пікету на плошчы Перамогі 29 снежня. Суд Чыгуначнага раёну Віцебску пакараў Аляксея Прохарава штрафам у памеры 50 базавых велічынь, Тацяну Севярынец аштрафавалі на 20 базавых. Абодва прызнаныя парушальнікамі заканадаўства аб масавых мерапрыемствах, паведамляе "Віцебская Вясна".



Аляксей Прохараў на судзе. Фота: "Віцебская Вясна"

Справу **Аляксея Прохарава** разглядала суддзя **Алена Цыганкова**. Прохараў, абвінавачаны паводле ч.3. арт.23.34 КаАП, не адмаўляў, што 29 снежня быў на плошчы і трымаў плакат са словам «Незалежнасць». Але патлумачыў, што ў сваіх дзеяннях кіраваўся арт. 57 Канстытуцыі, якая на кожнага грамадзяніна накладае абавязак бараніць незалежнасць краіны. Паводле Прохарава, каб паказаць, што пагроза незалежнасці тычыцца абсалютна ўсіх грамадзян, ён прынёс на плошчу дзяржаўны чырвона-зялёны сьцяг і трымаў яго падчас акцыі.

Нягледзячы на гэта, суддзя Алена Цыганкова прызнала Прохарава вінаватым у парушэнні заканадаўства аб масавых мерапрыемствах і пастанавіла пакараць віцябляніна штрафам у памеры **50 базавых велічынь** (1350 рублёў).

Падчас працэсу суддзя адхіліла хадайніцтва Прохарава вярнуць пратакол на дапрацоўку ў РАУС, бо дакумэнт быў складзены некарэктна (міліцыянты, паводле пратаколу агляду, умудрыліся за 1 хвіліну «агледзець» 4-хвіліннае відэа). Адмовілася суддзя складаць і прыватную пастанову на адрас РАУС у сувязі з гэтым.

Для Аляксея Прохарава гэта другі штраф паводле арт. 23.34 КаАП, якім пакараны цягам году. 26 снежня 2019 году суд Кастрычніцкага раёну Віцебску аштрафаваў Прохарава на 5 базавых велічынь (127 рублёў) за публічныя заклікі ў сацсетках браць удзел у антыінтэграцыйных акцыях. 30 студзеня яго пакаралі штрафам у 10 разоў большым…

Прохараў будзе абскарджваць рашэнне суду Чыгуначнага раёну ў Віцебскім абласным судзе.

У той жа дзень, 30 студзеня, у судзе Чыгуначнага раёну за ўдзел у акцыі ў падтрымку незалежнасці, якая прайшла на плошчы Перамогі ў Віцебску 29 снежня, была пакараная штрафам у памеры **20 базавых велічыняў** актывістка БХД **Тацяна Севярынец** (ч.1 арт. 23.34). Пастанову аб пакаранні вынес судзьдзя **Дзяніс Аляксеенка**. Сама Тацяна Севярынец на суд не прыйшла.

Нагадаем, што 23 снежня, суд Першамайскага раёну аштрафаваў Севярынец на 30 базавых велічынь паводле таго ж артыкулу (ч.1 арт. 23.34 КаАП), але – за публічныя заклікі ў інтэрнэце браць удзел у акцыі на плошчы Перамогі.

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з

днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

CC BY